НАВІНКІ КНІГАВЫДАННЯ




# ВЫБРАНАЯ ЛІРЫКА

**У канцы мінулага года выйшла з друку новая паэтычная кніга, аўтарам якой з'яўляецца ветэран літаратурнага руху, член СПБ, беларуская паэтэса з Гродна Марыя Шаўчонак. Зборнік лірыкі «Рэха маіх слядоў» (*Лідская друкарня, 2024)* прымеркаваны да 80-годдзя Марыі Сіланцьеўны.**

У новы зборнік вершаў Марыі Шаўчонак увайшлі як новыя вершы, так і напісаныя раней. Радзіма, хараство наваколля, каханне і пошук сэнсу жыцця – галоўны лейтматыў усёй творчасці паэтэсы. Гармонія пачуццяў і паэтычнага слова робіць яе паэзію музычнай, таму і натхняе кампазітараў на напісанне лірычных песень. У зборніку прадстаўлены два раздзелы беларускамоўных і рускамоўных вершаў. Кніга разлічана на шырокае кола чытачоў, якіх вабіць высокае слова паэзіі.

***Анатацыя***

***

Прадмову да зборніка выбранай лірыкі Марыі Шаўчонак «Рэха маіх слядоў» напісала кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры беларускай філалогіі Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы, член Саюза пісьменнікаў Беларусі, літаратуразнаўца, літаратурны крытык, паэтэса Аліна Сабуць. Артыкул надрукаваны ў часопісе «Полымя». Прадмовай да рускамоўнага раздзелу новай кнігі Марыі Сіланцьеўны стаў чытацкі водгук, аўтар якога Галіна Сямёнава. Раздзел адкрываецца кранальным прысвячэннем паэтцы з нагоды юбілею ад яе землякоў, аўтар Валянціна Нікіціна (Клічаўскі раён, Магілёўская вобласць).

У кнізе больш за 320 старонак, пераплёт цвёрды. Тыраж 50 экзэмпляраў. Карэктар член СПБ Анатоль Апанасевіч. Выдавец і паліграфічнае выкананне – ГАУПП «Лідская друкарня». Выданне аздоблена маляўнічымі фотаілюстрацыямі.



***Для даведкі***

У 1979 годзе народны паэт БССР Максім Танк уручыў членскі білет Саюза пісьменнікаў маладой паэтэсе Марыі Шаўчонак. З таго часу мінула 45 гадоў. Менавіта гэтай даце і прысвечана кніга вершаў «Рэха маіх слядоў». Але яшчэ нашмат раней, у 1971 годзе выйшаў яе першы паэтычны зборнік «Белая ластаўка», які спадабаўся чытачу з Наваполацка Івану Вараб'ёву. Ён напісаў на вершы з гэтай кнігі тры песні: адну для хора, дзве – для вакальнай групы. А Уладзімір Суэцін напісаў песню для хора «Шчучынскі вальс». На вершы Марыі Шаўчонак напісана каля трыццаці песень. «Песня пра Гродна» атрымала дыплом першай ступені на конкурсе Гродзенскага гарвыканкама. У выкананні інструментальнага ансамбля «Гарадзенскія трубы» і саліста Віктара Савашэвіча адкрываўся адзін з фестываляў нацыянальных культур у Гродне. Падборкі вершаў Марыі Шаўчонак перакладзены на англійскую, польскую, латышскую, рускую і іншыя мовы. Творчасць паэтэсы адзначана медалём Саюза пісьменнікаў Беларусі «За вялікі ўклад у літаратуру».

Яшчэ пра аўтара

**САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ**
**Гродзенскае абласное аддзяленне**